

Ніна Гарагляд

# Да вытокаў сваіх

*Вершы*

***Гарагляд (Дзякава) Ніна Васільеўна*** нарадзілася 20 лютага 1952 года на хутары Паўлінава Пінскага раёна. Скончыла філалагічны факультэт Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна. Працавала на Брэсцкім тэлебачанні і радыё, настаўнічала на Камянеччыне. З 1974 г. працоўны шлях Н. Гарагляд звязаны з камянецкай раённай газетай «Навіны Камянеччыны»: была літсупрацоўнікам, загадчыцай аддзела пісьмаў і сацыяльных праблем, намеснікам рэдактара, рэдактарам (2003—2008). Выдала некалькі паэтычных кніжак, «Душа мая босая...» (2025 г.)

* * *

У шумным горадзе стане няўтульна.
Мне б вясковай на дзень цішыні...
Палячу на Палессе птушкай —
Да вытокаў сваіх, да радні.

А з радні — адна сястра.
Вось ідзе з горада з кульбай...
Як убачыла мяне —
З рукі выпаў кошык з бульбай...

Плача сястра і смяецца,
Туліць мяне да грудзей...
А з прысадаў, услед за намі,
Цішыня на цыпках ідзе.

* * *

Апусцелы, людзьмі закінуты.
Адно Богам не адрынуты.
Патануў у дзікіх рамонках
Хутар мой, што на песню быў звонкі.

Хаты згорбіліся сіратліва,
Вочы вокнаў глядзяць сарамліва...
Стары крыж-абярэг стаіць з краю.
Ручніком, як рукой, мне махае...

* * *

Не выцягну стрэмку да скону:
Я родам з сіроцтва, з дзетдома,
Казённая — нібы варона,
Якая ў мяне абарона?
Ішла я з душою наросхрыст,
А ліпла ў дарозе кароста.
На свет, як дзіця, глядзела,
Ды столькі падману мела.
Адпіхвалі локцямі ўпарта:
Пад сонцам ты быць не вартая!
Здавалася: вось агрызнуся!..
Ды зноў саступлю, усміхнуся.
У вачах дабрыня і стома...
Я родам з сіроцтва, з дзетдома.

* * *

Павешу на абразок
Вышываны ручнічок.
Ходнічак засцялю
Ды песню запяю.
Тую, што маці спявала,
Як на кроснах ткала:
— Ой, пайду я гаем
Сваю долю пагукаю.
Азваўся з гаю каханы —
З ім на ручнічок стану...
Ручнік крыжыкам вышываны —
Як на покуці ў хаце мамы.

* * *

Дождж сняжок счарнелы дзяўбе.
Заблукала хвілінка ў дзень...
На карчах — хусткі белых туманаў.
Цёплы люты хмеліць, дурманіць.

Па гразі да вярбовых коцікаў,
Бы дзяўчына, лячу ў боцікаў...
Цуд пушысты ў руках трымаю.
У вясны прыпыняюся з краю.

* * *

Твая куртка сохне на шнуры.
Не ў нашым — у чужым двары.
Я пагляд жаллівы адвяду.
Як ваду ў вядзерцы, панясу бяду.

Смутак засцілае мае вочы:
З новай музай праз дарогу крочыш.
Ля цябе дачка чужая скача...
А свая — без таты ў хаце плача...

* * *

Да асенняе краскі
Шчэ ляціць матылёк...
Да мяне ты па восені
Заблукаеш здалёк.

Стол накрыю я госцю.
Завару чай пахкі.
— Еш пірог, — я скажу,
Дакрануся цішком да рукі.

Для цябе я пякла.
Хрызантэмай цвіла...
Ты прыехаў, і туга
Туманамі сплыла...

* * *

Я думала, што пражыву без вершаў.
І без пакут. Сыду са сцэны ў залу...
Ды, нібы мной пакрыўджаныя дзеці:
— Нас не кідай! — так вершы мне сказалі.

— Як змоўкнеш — спеваў птушак не пачуеш.
Пах квету яблынь не аблашчыць маем...
Бо стане да ўсяго душа глухая...
А з намі — дык яна заўжды жывая!